**Прыемнае таварыства**
**(Excerpt in Russian)**

Translated by: Inesa Kuryan
Contact of the translator: plucha@mail.ru

**Дэкалог**

Гэта было, мабыць, маёй памылкай, — распавядаў ён, нязграбна разгротваючы адной рукой пакуначак са жвачкай, – карацей, я ёй адразу даслаў смс, што буду чакаць пры стаянцы таксовак. Каля вакзалу. Яна ажно двойчы званіла мне і ўвесь час тлумачыла: – Дык я стаю, маўляў, ля таксовак. – І я стаю ля таксовак, – кажу, – срэбны рэно меган. – Нешта я вас не бачу. І гэтак мы пару разоў бла-бла-бла... – Дык вы дзе? Ля таксовак? – Так, наўпрост ля ўваходу. – Ля ўваходу да чаго? – Здаецца, тут Макдональдс, – кажа яна. – А чаго вы там? Я ж вам кажу – я ля таксовак. Ашалець можна. Я чакаў яе яшчэ пяць хвілін, пакуль спадарычна дацёпала да таксовак. І вы ж паслухайце, як яна разважае: – Прабачце, але ж там пры ўваходзе таксама таксоўкі стаяць. Я ажно здрыгануўся: – Ну, і трэба было ўзяць сабе адну з тых таксовак да Копера, калі вам яны больш адпавядаюць, – адказаў я ёй. Яна непрыязна зірнула на спадарожніцу, адну сімпотную студэнтку, і адвяла вочы ўбок. Мая б воля, выкінуў бы яе з машыны, але тады канюшанка была б няпоўная. Я пакумекаў дома, і потым дадаў да сваёй стандартнай абвесткі пра спадарожны аўтасэрвіс такі радок: ХОЧАШ ЕХАЦЬ, САМ ПАДЫДЗІ ДА ТРАНСПАРТНАГА СРОДКА .

У яго нарэшце атрымалася левай рукой вытрасці з пакуначка дзве жуйкі, правая ж надзейна ляжала на рулі. – А яшчэ была гісторыя, як я падвозіў дзівака з дрэдамі. Я такіх за кіламетр абыходжу. Ну, вось, скажы, ты сустракаў калінебудзь на добрай пасадзе дзівакоў з дрэдамі? Мяркую, не. Ты сустракаў дзівакоў у дрэдамі, каб яны не былі абкураныя? Мяркую, не. І гэты цыбаты малалетка сядае да мяне ў машыну спераду, і адразу, як мы выехалі на аўтастраду, пачынае ляпіць сабе самакрутку. Нічога асаблівага, толькі табака, гэта дакладна, бо ён быў у мяне на фотастопе, як кажуць. Паспрабаваў бы ён выцягнуць нейкай зялёнай траўкі з кішэні, бог сведка, асабіста адвёз бы яго да бліжэйшага пастарунку. А калі ён гэтую самакрутку рабіў – ты б паглядзеў! – ён гэтую цыгарку і пагладжваў, і туды-сюды абмінаў, а пасля – ну, як я і прадчуваў –

пытаецца, блін-кампот, ці прадугледжана стаянка на пару зацяжак. Я без грубасці вярнуў яго на месца загрузкі: хай дома зацягваецца, сукін сын. З-за яго цэлы дзень маёй працы пайшоў прахам. Увечары, калі я крыху суняўся, я дапісаў у абвесцы: СТАЯНКІ ДЛЯ КУРЦОЎ, ТЫМ БОЛЬШ ДЛЯ НАРКАЦМОКАЎ НЕ ПРАДУГЛЕДЖАНЫЯ.

Ён пасля нейкі час нэрвова пераключаў радыястанцыі. Ніводны сучасны шлягер яму не заходзіў, а тое, што выпадала, ён слухаў тры-чатыры секунды максімум, і зноўку нешта шукаў. “Нічога прыстойнага – лайно нейкае. Адно лайно пушчаюць. Калі настала эра Youtube, на хвалях піляць такую музыку, што хіба толькі ў крамах можна слухаць. Па мне дык першы канал, Val 202, і гэтыя ідыёцкія оперы – ўсё гэнае дзяржаўнае лайно я б неяк хуценька пазакрываў. Не шкада”, – сказаў ён як адрэзаў і вырубіў радыёкропку. “Падвозіў я аднойчы адну швабру ў спарціўках, чакай, дзе ж я яе падхапіў? Здаецца, яна села ля кіно “Шышка”. Балканская прыблуда, ясная справа. І, уяві, лезе ў салон у сваіх спарціўках. Ну, што яшчэ народцу не ясна? У спарціўках добра хату пыласосіць, а не на людзях з’яўляцца. Панаехалі тут, зрабілі з Любляны танны кірмаш, мякка кажучы. А калі я назад ехаў, то наогул быў капец. У Партарожу прыйшлі на маршрут дзве фэфы. Малалеткі, гадкоў па дваццаць. Хутка стала ясна, што яны мataліся на мора на дзянёк, бо яны пра ўсё самі адна адной распавядалі і ўвесь час рагаталі нямаведама з чаго. Я не вытрымаў і прынюхаўся да іх. Проста нахіліўся – напітыя. Адна па дарозе пачала ванітаваць, другая ж з яе смяялася, дурная карова. Думаў, не вытрымаю і выкіну абедзвюх на трасе. Урубіў вентыляцыю на ўсю катушку, каб ім троху сумленне ўзварушыць, ды не дамагло. І недзе на палове дарогі, ты ж паслухай, Андрэю, як пярун з яснага неба, адна з іх пытаецца ў мяне: Вам не будзе замінаць, калі я здыму красоўкі? На кароткі час завісла цішыня. – Мазоль нацёрла. І абедзьве зноў пырснулі рогатам. Тым часам фэфа ўсё ж сцягнула свае красоўкі. Спачатку красоўкі, а следам яшчэ і шкарпэткі. І гэтак акуратненька іх паклала на сядзенне паміж імі. Такія скручаныя белыя баваўняныя кароткія шкарпэткі. Я ледзь не пачаў рыгаць. Гэта так смярдзяць ногі ў дваццацігадовай малодкі! Як хрэн у пляшывага дзеда. Убойны пах. Я непрамядляльна, толькі давялося ў Любляне пазбавіцца гэтых дзевак, паехаў на аўтамыйню, каб мне ўсё пасля іх з парашком адмылі. Пасля ж, зразумела, падрэдагаваў сваю абвестку: ПАДПІТЫХ НЕ БЯРЭМ, РАЗБУВАЦЦА Ў САЛОНЕ НЕ ДАЗВАЛЯЕЦЦА.

З пазу пры дзвёрцах ён выцягнуў стары чэк, зазірнуў у яго хутка і выплюнуў туды жуйку. Скамячыўшы кульку з гумы і паперкі, укінуў назад у паз, цяжка ўздыхнуў. – Потым нейкі час усё ў мяне ішло нармалёва, але ж, не памятаю, здаецца, ў ліпені, бо спякота стаяла жудасная, да мяне сеў адзін тыпус, прыкладна майго ўзросту. Акуратны, пунктуальны... Мне, прызнаюся, ён глянуўся, і я пачаў яго раскручваць на размову: чым ён займаецца, дзе працуе. Сказаў, што ён блогер на zirnislavenija.si. І адразу нечага панаплёў, не варта, маўляў, верыць усяму, пра што пішуць у блогах. Вось тут і я не вытрымаў. І калі я сказаў, што, як па мне, хай хоць заўтра зачыняць нацынальнае тэлебачанне і ўсіх гэтых чырвоных камісараў роўненька вышлюць на копку бульбы, тады ён яшчэ больш расправіў крылы... “А вы калі-небудзь прабавалі зразумець, колькі дурасці было ў часы нашай маладосці? – спытаў мяне гэты тыпус і пачаў неяк занепакоена ёрзаць. – Вас хапала за жывое пытанне, чаму лекары ніколі не падаюць стытыстыкі пра пабочныя наступствы прышчэпак? Вас цікавіла калінебудзь, ад якога часу стала злачынствам думаць сваёй галавой?” Тут я павінен быў яго крыху спыніць. – Мая былая жонка працавала у фармацэўтычнай кампаніі “Лек”, – сказаў я, – таму ў мяне даволі добрае ўяўленне пра гэтыя пытанні. І прышчэпкі – гэта неабходны злачын меншага фармату. Няма іншага паратунку. А ён мне ў адказ засіраў галаву новымі тэорыямі змовы, напрыканцы ж сказаў: – Вы можаце пaглядзець інтэрвію з Нормай Карошац[1], яна ўсе звесткі па тэме праштудзіравала. Скапіруйце спасылку на маёй старонцы. Вось на яе вам дакладна трэба звярнуць увагу. Файная цётка, – дадаў ён. На шчасце, я ўжо падруліў да Oly Burger, дзе пасажыр выходзіў. У мяне пасля яго башка трашчала. Гэта адзін з тых тыпаў, што сваімі непрышчэпленымі дзецьмі завірусоўвае нашыя дзіцячыя садкі, а сам потым дома дрочыць на Норму Карошац. Мяне ажно разрывала ад злабы. Я зноў паправіў тэкст абвесткі: НЕ БЯРУ НА БОРТ АНТЫВАКЦЫНАТАРАЎ.

Скажу табе шчыра, Андрэю, – працягнуў ён размову, крыху памаўчаўшы ў думках, – няма горай, як гэтыя адвечна спрагнёныя “моладзеж і подросткі”. Я не паспяваю нават на аўтастраду выруліць, як яны выцягваюць з заплечнікаў

1 Вядомая славенская тэлевядоўца

бутэлькі і бясконца жлукцяць ваду. Столькі вады ім патрэба, быццам яны пеларгоніі на балконе. Ім што, яе дома шкадуюць? Ну, выпей ты поўную шклянку

і выходзь з хаты. Дык не, “моладзеж і падрасткаў” не цікавіць звычайная шклянка вады, ім трэба цмактаць глыток па глытку, і важна, каб гэта быў вітамінізаваны напой з экабутэлькі. Я не прымушаю, канешне, іх купляць звычайную мінералку ў прадуктовай краме, але гэтых экабутэлек вочы б мае не бачылі. Яна адна каштуе мінімум 20 еўраў, а наша заўсёды гаротная студэнцкая шпана гэта купляе, наракаючы потым, што не мае грошай на праезд. І на нас спадзяюцца. Фу. Я так распаліўся тады, што дадаў у абвестку: ЖАВАЦЬ ЦІ ХЛЯБАЦЬ У САЛОНЕ НЕ ДАЗВАЛЯЕЦЦА (ВАДУ ТАКСАМА).

– Мне ўжо падавалася, што я перасцярогся ад усіх праблемаў, – сказаў ён і з бардачка спраўна выняў CD, трымаючы левую руку на рулі. Потым ён хутка ўставіў у прайгравальнік дыск з далмацінскімі хітамі. – Дзе там, дружа! Села да мяне аднойчы нейкая малодка, у яе канцы валасоў былі пафарбаваныя на блакітны колер, карацей кажучы, адразу бачна, што не ўсё ў яе гладка. – З вамі я бліжэй бы пазнаёмілася, – кажа мне на паўдарогі. – У вас ёсць асаблівае пачуццё гумару. – Вы пра што? – перапытаў я. – Вашая абвестка. Думаю, вы яе на перавозках адпрацавалі. Крытыка сучаснага грамадства ў корань. Брава.

У мяне неяк не ўкладалася ў галаве, што я на гэта маю адказаць, таму я маўчаў і не даваў ёй повад для далейшай размовы. Усё ж, як не круці, з дзяўчатамі з сінімі канцамі валосся няпроста. А з ёй адначасна сеў яшчэ адзін тып з прыбабахам, хлопец у пінжаку. Сказаў, што едзе на выпускны свайго брата. А калі на Святамарцінскай утварыўся затор, хлопец пачаў нэрвавацца, і, мабыць, нешта ў гэтага разумніка ў касцюме і блакітнай кашулі шчоўкнула ў мазгах, бо калі мы з затору нарэшце выехалі, ён мне кажа: – А вы можаце мяне падкінуць да Палацу культуры? Я надта спазняюся, а яшчэ мушу на бус чакаць... Я маўчаў. Што сабе гэты красаўчык дазваляе? Я ж яму не таксі. – Я даплачу, – кажа, – ды зазірае ў свой кашалёк. – У мяне гатоўкай ёсць 20 еўраў. Больш не магу даць, – кажа. Ну, я і павёз яго ў цэнтр, па што мне ад 20 еўраў на халяву адмаўляцца. Але ж на гэтага нахабнага красаўчыка я не забыўся, бо праеў-такі ён мне пячонкі. Таму наступнага дня раніцай я напісаў удакладненне ў абвестку: ПЕРАВОЗКІ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЦА ТОЛЬКІ ПА ЎЗГОДНЕНЫМ МАРШРУЦЕ. Пасля абеду дадаў яшчэ: (ЗАТОРЫ НЕ ЗМЯНЯЮЦЬ ТРАСЫ).

Ён небяспечна нахіліўся ў правы бок да пазу каля пасажырскага сядзення і нешта прабаваў намацаць. Выцягнуў сонечныя акуляры і іх начапіў. Сказаў праз цяжкі выдах: – Вось такое жыццё, Андрэю! На свеце шмат дзівакоў і дзівосаў. І

нешта лічба гэтая не змяншаецца, хоць плач... Апошнім часам да мяне па перавозку звярнуўся нейкі Мірак, ну, і прасіў, каб я яго забраў з аўтобуснага прыпынку пры Мецелкавай2 вуліцы. Ужо гэта мяне насцярожыла. Я заўсёды абмінаў Мецелкаву па вялікім коле. Ён на тое сказаў, што ён на мыліцах, і яму цяжка было б дайсці да вакзалу. А было гэта акурат пасля навагодніх святаў, тут усё як два плюс два вылічвалася. Спачатку трэба было перціся на горналыжны курорт у Швайцарыю, пасля ж енчыць, што паламаў косці. Бачыў я такіх. Ніякай адказнасці перад сабой. Ніякай і ніколі. Таму я сказаў, што ў мяне поўны салон, хоць ён пэўна скумекаў, што я гэта на ходу прыплёў. Ай, мне ўсё роўна, што ён там думае. Я напісаў у абвестку катэгарычна: ЗАБОР ПАСАЖЫРАЎ ВЫКЛЮЧНА НА Ж/Д ВАКЗАЛЕ (ВАРЫЯНТЫ НЕ РАЗГЛЯДАЮЦЦА). Чалавек чалавеку павінен ясна фармуляваць, як і што. Калі з першага разу не даходзіць.

<…>

WHATSAPP

- Крц, я ў машыне. Пбч нейкі мардасты, а вадзіла быццам норм.

Nina: Кккк, жмі на газ.

- Адыбіся.

Nina: А месца ок?

- Так. Ззаду па дыяганалі. Відос, што трэба. Хахахах.

FACEBOOK

Той выпадак, калі вязеш 2 барбі і 1 душнілу да Лукавіц і ніхто ані слова не сказаў.

TWITTER

2 Мецелкава вуліца ў Любляне пасля 1991 г. стала на базе старых прамысловых будынкаў месцам
вольных творцаў і сядзібаў альтэрнатыўных арганізацый, якія далі яму назву Горад Мецелкава.

Той кашмарны выпадак, калі прасячэш, што музон у аўто твайго перавозчыка не з радыёкропкі, а з сідішкі. #prevozi #shyamalan

INSTAGRAM

(фотка джынсаў у абліпку і белых класных красовак)

#newoutfit #fashion #instafashion #ontheroadagain

FACEBOOK

Bojan Krajnc пакінуў каментар да вашай публікацыі:

2 барбі? Не падкінеш нам хоць адну на Малечнік?

- Адна плоская, а другая нішто сабе, з пярчынкай.

Bojan Krajnc пакінуў каментар да вашай публікацыі:

А яе прапануем Кокі))

- О, Кокі з ёй бы даў жару.

Bojan Krajnc пакінуў каментар да вашай публікацыі:

А ты мо ўжо ўставіў свой патык у тую шчэпку, майструк?

- Чакаю, што яна скажа.

Bojan Krajnc пакінуў каментар да вашай публікацыі:

Не тармазі, снікерсні прама па курсу, калі яна без пары. Не губляй часу.

WHATSAPP

Nina: Што чвць з тым немардастым?

- Вадзіла ўвесь час на фэйсе вісіць.

Nina: Кккк, незадача. Усе смазлівые такіе. І з кім пішацца?

- Эй, адыбіся.

TWITTER

Вадзіла ўрубіў свой музон напоўную, ажно я аглох напалову. Суседка мне прызналася, што ў яе няма хлопца, як мяне ўсе дасталі. #prevozi

INSTAGRAM

(фотка ахутанага туманам кустоўя пры заездзе ў тунэль)

#forest #lovenature #outdoor #igslovenia #homeland #wilderness
#nofilterneeded

FACEBOOK

Anže Novak пакінуў каментар да вашай публікацыі:

Тую во з пярчынкай во сюды прывазі. Мы акурат стол накрываем.

- Сказала што без хлопца.

Bojan Krajnc пакінуў каментар да вашай публікацыі:

Спытай колькі ёй чавапаў пакінуць?

Anže Novak пакінуў каментар да вашай публікацыі:

Адзін чавапец найвялікшы мы ёй гарантуем.

Bojan Krajnc паставіў лайк да каментара публікацыі Anže Novak.

INSTAGRAM

beauty_me пакінула каментар:

Куды едзем, цянка-абяцанка?

- Сама знаеш, памірыліся.

beauty_me пакінула каментар:

лол

TWITTER

Ён тыпова па-марыборску жуе канчаткі і рэдукуе галосныя пад настрой, цяпер і зычные пачаў гасіць. Сказы не маюць складу, а дзеясловы асабовых займеннікаў. Яна тыповая безпрынцыпная люблянская скубанка, якая паловы яго словаў не разумее, а палову ёй і не трэба разумець. Шчаслівая парачка. Да Траянаў яны пра ўсё дамовяцца. #prevozi

WHATSAPP

Nina: iiiiii?

- Чаго такая скорая? Справы не маеш?

Nina: Netflix мая справа)). Колькі бярэш ужо спытаў?

- Не яшчэ, больш на фэйсе вісіць, длб.

Nina: А што той сусед?

- Той чыста фрык, з барадой, пісаніну нейкую перачытвае.